“арлы”): *“Сівыя сокалы – сваты твае, / Чорны шоўк – коскі твое, / А золото – слёзкі твое”* [1, с. 89]; *“Наляцелі арлы да калодзежа, / Чулі яны, што вада халадна. // Наехалі сваты да Алесі, / Чулі яны, што работніца ды красавіца”* [1, с. 81].

Такім чынам, можна канстатаваць, што ў вясельных песнях, якімі суправаджаюцца розныя абрадавыя этапы, шырока выкарыстоўваюцца зааморфныя вобразы-сімвалы, што дае падставы сцвярджаць аб міфалагічным характары мыслення нашых продкаў, паэтычнасці светапогляду беларусаў.

**Літаратура**

1 Вяселле на Гомельшчыне: фальклорна-этнаграфічны зборнік / уклад. В. С. Новак. – Мінск: ЛМФ “Нёман”, 2003. – 472 с.

***А. П. Шукаловіч***
*Навук. кір.* ***В. С. Новак,***
*д-р філал. навук, прафесар*

## ПРЫКМЕТЫ І ПАВЕР’І Ў ВЯСЕЛЬНАЙ АБРАДНАСЦІ ЛЕЛЬЧЫЦКАГА РАЁНА

У вясельнай абраднасці Лельчыцкага раёна, якая захоўвае агульнаэтнічную аснову, знайшлі яскравае адлюстраванне міфалагічныя ўяўленні, звязаныя з элементамі жыллёвай прасторы, прадметнай атрыбутыкай і інш.

У этнаграфічных апісаннях вясельнага абрадавага комплексу ў розных лакальных традыцыях важнае месца займаюць прыкметы і павер’і, якія датычаць міфалогіі жыллёвай прасторы. Адзначым, што важнае магічнае значэнне мае такі элемент хаты, як парог, які ў народных вераваннях асэнсоўваецца як месца знаходжання душ памерлых. У в. Сіманічы падчас абрадавага этапа сустрэчы маладых *“і молода с порога начынае сеяць жыто”* [1, с. 300], што, паводле народных уяўленняў, павінна было сімвалічна забяспечыць ураджайнасць нівы.

У мясцовых прыкметах і павер’ях з’яўляецца адметным асэнсаванне семантыкі дзяжы як важнага прадметнага атрыбута вяселля. Менавіта з ёю звязаны рытуалы ў традыцыйным вяселлі вв. Сіманічы, Маркоўскае. Згодна з народнымі вераваннямі, маладая павінна была сесці на дзяжу, калі захавала цнатлівасць. Лічылася вялікім грахом, калі дзяўчына сядала на дзяжу, не з’яўляючыся “чыстай”: *“Потом вуносіць свекруха дзежку і засцілае надзежніцаю”* [1, с. 300], *“Выходзіць матка, выносіць кажуха, вываРочвае яго. Выносіць дзежку і ставіць на шляху маладой”* [1, с. 317].

Прыкметы і павер’і, якія вылучаюцца ў структуры вясельнай абраднасці Лельчыцкага раёна, ілюструюць семантыку такога прадметнага атрыбута, як кажух, які, лічылася, сімвалізаваў багацце і ўплываў на дзетанараджэнне: *“Калі ж прыежджаюць сваты і малады до двара молодой, то свацце ідуць прыглашаць до хаты, а цешча надзевае кожуха навыворот”* (в. Сіманічы) [1, с. 297].

Такім чынам, вясельная абраднасць Лельчыцкага раёна вылучаецца багаццем міфалагічных уяўленняў, прадстаўленых у прыкметах і павер’ях, якія цесна звязаны з рознымі абрадавымі этапамі і рытуаламі.

**Літаратура**

1 Вяселле на Гомельшчыне: фальклорна-этнаграфічны зборнік / І. Ф. Штэйнер, В. С. Новак. – Мінск: ЛМФ “Нёман”, 2003. – 472 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ